Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па навуковай рабоце
БДУКМ
_______________ В.Р.Языковіч
16.01 2020

ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ
**Асновы этнаграфіі і фальклору**
спецыяльнасці перападрыхтоўкі
2-23 02 72 Культурна-адпачынкавая дзейнасць
кваліфікацыя:*арганізатар культурна-адпачынкавай дзейнасці*
у адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам перападрыхтоўкі,
зацверджаным 02.08.2016 г., рэг. № 25-13/187

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск, 2020

Распрацоўшчык праграмы:
*І. І. Кірчук*,старшы выкладчык кафедры культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплінІнстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
*А.І. Сцепанцоў*, прафесар кафедры культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі, дацэнт

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэкамендавана да зацвярджэння:

Кафедра культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
Пратакол пасяджэння ад 14.01.2020 № 1

Савет Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
Пратакол пасяджэння ад 16.01.2020 № 1

# УВОДЗІНЫ

Вучэбная праграма па дысцыпліне «Асновы этнаграфіі і фальклора» складзена згодна з адукацыйным стандартам перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў па спецыяльнасці 2-23 02 72 «Культурна-адпачынкавая дзейнасць».

Праграма дае веды па пытаннях этнакультурнага развіцця беларусаў. Структура дысцыпліны складаецца з дзвюх узаемазвязаных частак: асновы этнаграфіі Беларусі і вывучэнне фальклору.

**Мэта**праграмы: фарміраванне ведаў пра беларускі фальклор і этнаграфію ў кантэксце традыцый іншых народаў, асэнсаванне спадчыны продкаў, ацэнка культурных здабыткаў сучаснасці.

**Задачы** праграмы:

даць слухачам устойлівыя веды аб гісторыі станаўлення і развіцця беларусаў;

азнаёміць слухачоў з материальнай і духоўнай культурай беларусаў;

вывучыць традыцыйны беларускі каляндар;

паказаць сямейна-родавыя, рытуальна-абрадавыя комплексы, якія бытавалі на Беларусі;

раскрыць міфапаэтычную мадэль свету беларусаў.

**Метады**навучання:тлумачальна-ілюстрацыйны; рэпрадуктыўны; праблемнагавыкладання; даследчы.

**Сродкі** навучання:падручнікі, навучальныя дапаможнікі, дыдактычныя матэрыялы, кнігі-першакрыніцы, педагагічныя тэсты, тэхнічнае абсталяванне, рэканструкцыя элементаў фальклорных абрадаў.

**Асноўныя патрабаванні да вынікаў навучання** ў рамках праграмы.

Слухачы павінны:

*ведаць:*

тэрміналогію фальклору і этнаграфіі ў сістэме навуковых дысцыплін;

гісторыю станаўлення і развіцця беларусаў;

асаблівасці традыцыйнай культуры, звычаі, абрады, вусна-паэтычную спадчыну беларусаў;

роды, віды, жанры і ўнутрыжанравыя разнавіднасці беларускага фальклору;

даты каляндарных абрадаў і святаў у беларусаў;

мастацкія асаблівасці вуснай народнай творчасці;

*умець*:

размяжоўваць гістарычныя стадыі ў развіцці этнаса;

вылучаць характэрныя рысы традыцыйнай культуры;

устанаўліваць жанравую прыналежнасць фальклорных твораў;

вылучаць спецыфічныя этнакультурныя рысы рэгіёнаў Беларусі;

аналізаваць асноўныя фальклорныя тэксты і этнічныя працэсы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № п/п | Назва раздзела, тэмы | Колькасць гадзін | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Круглыя сталы, тэматычныя дыскусіі | Лабараторныя заняткі | Дзелавыя гульні | Трэнінгі | Канферэнцыі | Самастойная работа |
| 1 | Этнагенез беларусаў. Этнічная тэрыторыя. Гісторыка-культурныя рэгіёны Беларусі | 4 | 2 | | | | | | | | 2 |
| 2 | Характэрныя асаблівасці матэрыяльнай культуры беларусаў | 4 | 2 | | | | | | | | 2 |
| 3 | Сямейна-радавыя, рытуальна-абрадавыя комплексы | 6 | 2 | 2 | | | | | | | 2 |
| 4 | Традыцыйны беларускі каляндар. Каляндарна-абрадавая паэзія | 4 | | 2 | | | | | | | 2 |
| 5 | Тэорыя фальклору. Гісторыя беларускай фалькларыстыкі | 4 | 2 | | | | | | | | 2 |
| 6 | Сямейна-абрадавая паэзія: слова, дзеянне, атрыбут. Пазаабрадавая паэзія | 4 | 2 | | | | | | | | 2 |
| 7 | Народная проза беларусаў. Народны тэатр | 6 | 2 | | | | | | | | 4 |
| **Усяго:** | | **32** | **12** | **4** | | | | | | | **16** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТПРАГРАМЫ

### Тэма 1. Этнагенез беларусаў. Гісторыка-культурныя рэгіёны Беларусі

Навуковыя тэорыіпаходжання этнасу. Балцкая тэорыя (В.Сядоў). Крывіцкая канцэпцыя (В.Ластоўскі, А.Шлюбскі). Канцэпцыі Я.Карскага, У.Пічэты, М. Піліпенкі. «Вялікапольская» і «вялікаруская» канцэпцыі паходжання беларусаў. Канцэпцыя старажытнарускай (усходнеславянскай) народнасці: аргументы «за» і «супраць». Пытанні аб продках беларусаў у параўнаўчым кантэксце суседніх народаў (палякаў, літоўцаў і інш.).

Старажытнае насельніцтва Беларусі паводле археалагічных даследаванняў, найбольш ранніх пісьмовых звестак. Рассяленне славянскіх плямёнаў на тэрыторыі Беларусі, іх узаемаадносіны з балцкімі плямёнамі. Этнічная тэрыторыя, яе сувязь з этнагенезам і этнічнай гісторыяй. Межы этнічныяі адміністратыўныя. Паняцці метраполіі і дыяспары.

Паходжанне назвы «Белая Русь». Беларусь на гістарычных картах.

Гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны.Паазер'е. Падняпроўе. Цэнтральная Беларусь. Панямонне. Усходняе і Заходняе Палессе. Разнастайнасць культурнага ландшафту. Багацце беларускай традыцыйна-бытавой культуры. Прыстасаванасць народнай культуры і побыту да мясцовых экалагічных і гістарычных умоў. Мясцовыя фарбы народнай культуры, яе рэгіянальныя і лакальныя варыянты.Агульныя рысы народнай культуры сумежных зон. Гістарычныя змены ў культурным ландшафце і геаграфіі рэгіёнаў. Роля рэк як гістарычных шляхоў зносін і кампанентаў ландшафту.

Комплексная характарыстыка асобных рэгіёнаў.Адметныя асаблівасці культуры і народнай жыццядзейнасці; гістарычныя помнікі і дзеячы культуры.

### Тэма 2. Характэрныя асаблівасці матэрыяльнай культуры беларусаў

Сядзібны комплекс: жыллё, падсобныя і гаспадарчыя памяшканні. Іх функцыі, некаторыя асаблівасці канструкцыі. Тыпы сядзібнай забудовы: замкнуты, аднарадны, двухрадны, трохрадны, Г-падобны, свабодны (двор з нязвязанымі пабудовамі), крыты. Брама, сад, агарод. Сацыяльныя і рэгіянальныя асаблівасці сядзібнай забудовы.

*Інтэр'ер* як унутраная прастора, функцыянальна і эстэтычна арганізаваная. Важнейшыя кампаненты інтэр'ера. Інтэр'ер курнай хаты (да 1860-х гг.). Традыцыйная мэбля, посуд і бытавыя рэчы. Асвятленне хаты: лучнікі, светач, каганец.

*Будаўнічыя звычаі, абрады, павер'і* ў народным дойлідстве. Выбар месца для жылля. Уяўленні аб праклятым і шчаслівым месцах. Будаўнічыя матэрыялы: абярэгі, улік сезона года і квадраў месячнага календара. Закладзіны. Кветка. «Задобрыванне» печы. Уваходзіны. Сакральны сэнс і абагаўленне хатняга ачага як аселішча дабра і шчасця.

*Народная гаспадарка.*Земляробства – асноўны занятак традыцыйнай гаспадаркі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беларусаў. *Старажытныя вытокі (паводле археалагічных знаходак – III тысячагоддзе да н. э.).Пераход ад матыжнага земляробства да ворыўнага.*

*Значэнне промыслаў і рамёстваў* у народнай жыццядзейнасці і ў сістэме культуры. Промыслы і рамёствы ва ўмовах прамысловага перавароту. Сучасны стан народных промыслаў, праблемы іх адраджэння.

*Адзенне* – этнічны і сацыяльны паказчык. Утылітарна-практычныя, этнакультурныя, эстэтычныя, абрадавыя і магічныя функцыі адзення. Тыпалогія адзення: мужчынскае, жаночае (яшчэ: дзяцячае, юнацкае); летняе, зімовае (верхняе), паўсядзённае і святочнае. Абрадавая вопратка. Матэрыялы. Каляровая гама. Асноўныя спосабы ўпрыгожвання: афарбоўка, узорнае ткацтва, вышыўка, набойка, адбельванне, мярэжка, аплікацыя, гафрыроўка, карункавы арнамент.

*Ежа*– нацыянальная спецыфіка, сувязь з мясцовай прыродай, схільнасць народа да пэўных страў і прадуктаў. Кулінарныя традыцыі беларусаў. Класіфікацыя страў: раслінныя, малочныя і мясныя прадукты; посныя і скаромныя; паўсядзённыя, святочныя і абрадавыя. Напіткі ў сістэме харчавання. Хлеб у традыцыйна-бытавой культуры беларусаў. Мучныя стравы. Саладуха і кулага. Крупяныя стравы. Бульба і гародніна. Рыба і рыбныя стравы.Пітво. Сімваліка-абрадавае значэнне страў і напіткаў у народным календарыі традыцыйна-бытавой культуры.

## Тэма 3. Сямейна-радавыя, рытуальна-абрадавыя комплексы

Этнадэмаграфічныя працэсы. Функцыі сям'і (агульныя заўвагі). Сям'я, сямейныя адносіны і абрады ў розных народаў (параўнальны аспект). Гісторыя беларускай сям'і: традыцыі і сучаснасць. Тыпы і структура сям'і. Радавод і сістэма сваяцтва. Сямейныя традыцыі і народная педагогіка. Сацыяльныя і рэгіянальныя асаблівасці сям'і, сямейных звычаяў і абрадаў.

Сямейна-радавыя, рытуальна-абрадавыя комплексы:радзіны, вяселле, пахаванне. Пахавальная абраднасць у гісторыі культуры. Семантыка і сімволіка пахавальнай абраднасці. Язычніцкая і хрысціянская пахавальная абраднасць. Курганы і могілкі – сведкі гістарычнай памяці. Мемарыяльныя помнікі і знакі, іх сакральна-этычныя, выхаваўчыя і этнакультурныя функцыі. Этнаканфесійныя і рэгіянальныя асаблівасці пахаванняў. Культ продкаў.

## Тэма 4. Традыцыйны беларускі каляндар. Каляндарна-абрадавая паэзія

Традыцыйны беларускі каляндар: міфапаэтычная мадэль свету беларусаў. Жанравыя песенныя формы (заклінальныя, рытуальныя, велічальныя, дакаральныя (жартоўныя) і абрадавыя лірычныя песні).

*Зімовы цыкл каляндарна-абрадавай паэзіі.*Куцця і дзяды. Феномен калядных «хаджэнняў» і «ваджэнняў». Мастацкі свет калядных песень. Сістэма персанажаў, міфалагізацыя вобраза гаспадарскага двара. Ваджэнне «казы» як



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

песенна-сімвалічнае адлюстраванне старажытнага ахвярнага абраду. Рытуальныя калядныя гульні і іх паэзія («Жаніцьба Цярэшкі», «Яшчур» і інш). Шчадроўскія песні. Песні на Васілле. Калядныя варожбы ў вербальнымвыражэнні.

*Веснавы цыкл каляндарна-абрадавай паэзіі.*Масленічныя песні. Гуканне вясны. Асноўныя матывы, рытуальна-міфалагічны змест і паэтыка вяснянак. Валачобныя песні. Веснавыя карагодныя і гульнёвыя песні. Юраўскія песні. Песні абраду ваджэння і пахавання «стралы». Траецкія, куставыя і майскія песні. Русальныя песні, іх арэал.

*Летні цыкл каляндарна-абрадавай паэзіі.* Склад летніх песень (купальскія, пятроўскія, касецкія, жніўныя песні).Структурна-семантычныя асаблівасці купальскіх песень. Жніўныя песні. Зажынкі і іх паэзія. Дажынкавыя песні: адлюстраванне абраднасці («палоць бараду», «завіванне барады», «вяртанне сілы», вянок (кветка), частаванне жнеек). Адметнасць талочных песень. Вобразы талакі і гаспадароў.

*Восеньскі цыкл каляндарна-абрадавай паэзіі.*Восеньскія каляндарныя песні – адметная асаблівасць беларускага фальклору. Прыродны, працоўны, бытавы кантэксты восеньскіх песень. Прадзільныя (піліпаўскія) песні.

## Тэма 5. Тэорыя фальклору. Гісторыя беларускай фалькларыстыкі

Аб'ём паняццяў «вусная народная творчасць» і «фальклор». Праблема аўтарства ў фальклоры. Тыпы фальклорных традыцый («архаіка», «класіка», «постфальклор»), культурна-гістарычныя і сацыяльныя крытэрыі іх вызначэння. Фальклор як папярэднік розных мастацтваў (музычны, драматычны, харэаграфічны фальклор). Фальклор як сінтэтычны від мастацтва. Адметныя рысы фальклору: а) калектыўнасць; б) традыцыйнасць; в) варыятыўнасць; г) вуснасць; д) сінкрэтызм.

Фалькларыстыка як навука, яе раздзелы: тэорыя фальклору, гісторыя фальклору і фальклорных жанраў, гістарыяграфія фалькларыстыкі, арганізацыя і методыка збірання фальклору, сістэматызацыя архіўных фондаў, тэксталогія і прынцыпы выдання фальклору. Метады і прынцыпы вывучэння фальклору. Методыка палявога і ўключанага даследавання фальклорных з'яў.

Рэтраспектыва беларускай фалькларыстыкі, яе сучасны стан.

*Малыя жанры фальклору.* Выслоўі як надзейная крыніца міфалагічных і этнаграфічных звестак. Пазатэкставыя сувязі выслоўяў (міфалогія, прыкметы, звычаі, абрады, павер'і, іншыя фальклорныя тэксты).Групы выслоўяў паводле іх зместу і функцыянальнага прызначэння. Прыказкі як звод народнай маралі. Галоўныя формы (прамое выказванне і іншасказанне), віды класіфікацый (алфавітны, лексічны, манаграфічны, генетычны, тэматычны, логіка-семіятычны). Загадкі. Функцыянальнае прызначэнне (міфалагічны і магічны аспекты), культурны кантэкст, старажытная тэматыка і яе гістарычнае пашырэнне (чалавек, прыроднае і культурнае асяроддзе). Аб'ект загадкі і яго метафарычны вобраз.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дзіцячы фальклор.* Узроставая дыферэнцыяцыя розных жанраў. Жанравы склад і прынцыпы класіфікацыі дзіцячага фальклору. Дзіцячы фальклор у кантэксце беларускай духоўнай культуры і этнапедагогікі. Вершаваныя і празаічныя, гульнёвыя і негульнёвыя жанры дзіцячага фальклору. «Паэзія калыскі». Функцыянальнае прызначэнне і мастацкія асаблівасці калыханак і забаўлянак.Сфера гульнёвай культуры. Песенны рэпертуар. Дражнілкі як частка народнай смехавай культуры. Сучасная дзіцячая субкультура і фальклор: «страшылкі», анекдоты, «чорны гумар».

## Тэма 6. Сямейна-абрадавая паэзія: слова, дзеянне, атрыбут. Пазаабрадавая паэзія

Паходжанне абрадаў, прысвечаных асабістаму жыццю чалавека. Асаблівасці і склад сямейна-абрадавай паэзіі, адлюстраванне ў ёй вераванняў, побыту, гісторыі народа.

*Радзінная паэзія.*Драматургія радзіннай абраднасці і яе паэтычнае ўвасабленне. Сістэма персанажаў. Жанравыя віды хрэсьбіннай паэзіі. Радзінна-хрэсьбінная тэма ў прыказках і прымаўках.

*Вясельная паэзія.*Асноўныя этапы вяселля, ідэйна-тэматычны змест вясельных песень і іх класіфікацыя. Тыпы вясельных песень. Галоўныя персанажы, асаблівасці мастацкіх вобразаў і паэтычнай мовы вясельнай паэзіі.

*Хаўтурныя галашэнні.*Вера ў замагільнае жыццё і магчымасць сувязі са светам жывых – аснова пахавальных і памінальных абрадаў. Пераважна жаночы характар галашэнняў. Тэма смерці як сямейнай трагедыі. Традыцыйныя кампазіцыйныя блокі галашэнняў. Дзяды.

*Пазаабрадавыя лірычныя песні.* Пачуцці і перажыванні як паэтычная рэальнасць лірычных песень. Сістэма маральных каштоўнасцей. Бытавы і сацыяльны канфлікт як аснова першаснай класіфікацыі пазабрадавай лірыкі. Феномен перажывання чужога лёсу як уласнага.Любоўныя песні (песні пра каханне). Сямейныя песні. Сюжэтныя сітуацыі сіроцкіх, удовіных, прымацкіх песень.Сацыяльныя песні.Рэкруцкія, салдацкія, казацкія песні. Жартоўныя і сатырычныя песні.Прыпеўкі.

## Тэма 7. Народная проза беларусаў. Народны тэатр

*Народная проза.* Склад фальклорнай прозы. Дыскурсіўная проза: міфалагічная, каляндарна-святочная, сямейна-абрадавая, народна-хрысціянская, магічная. Наратыўная проза: казкавая, няказкавая і іх смехавыя формы. Віды казак. Казкавая проза беларусаў. Жанры няказкавай прозы. Сінтэтычныя з’явы (легендарная казка, анекдатычная казка, гістарычна-тапанімічная легенда).

*Народны тэатр.* Драматургія. Прастора і час. Традыцыйныя ролі. Выканаўцы. Касцюмы і маскі. Рэгламентацыя паводзінаў. Абавязковыяі імправізаваныя дыялогі. Вяселле як народны мюзікл. Паўтаральнасць дзеянняў у карагодных гульнях. Элементы тэатралізацыі пры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкананні казак. Тэатральна-драматычныя прадстаўленні падчас кірмашоў і святаў. Творчасць скамарохаў.

*Беларуская батлейка.*Культурныя вытокі і яе нацыянальная самабытнасць. Віды батлейкі ,тэатральны рэквізіт. Рэлігійная частка батлейкі.Містэрыяльная драма «Цар Ірад». Інтэрмедыі ў складзе школьнай біблейска-евангельскай драмы.Батлейка як святочная забава.

Падбор музычнага і нотнага матэрыяла для лялечнага прадстаўлення. Развучванне песень прымеркаваных для батлеечных інтэрмедый: «Ой, там на рацэ», «Ой, Божае народжанне» і інш. Праца з батлейкавай скрыняй. Ваджэнне лялек. Складанне сцэнарыю батлеечнага спектаклю. Тэатралізацыя батлейкі на сцэне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ САМАСТОЙНАГА ВЫВУЧЭННЯ

## Тэма 1.Этнагенез беларусаў. Этнічная тэрыторыя. Гісторыка-культурныя рэгіёны Беларусі

***Пытанні***

1. Балцкая тэорыя (В.Сядоў) і Крывіцкая канцэпцыя (В.Ластоўскі, А.Шлюбскі).
2. Канцэпцыі Я.Карскага, У.Пічэты, М.Піліпенкі.
3. «Вялікапольская» і «вялікаруская» канцэпцыі паходжання беларусаў.
4. Канцэпцыя старажытнарускай (усходнеславянскай) народнасці. Пытанні аб продках беларусаў.

***Спіс рэкамендаванай літаратуры***


1. Пилипенко М.Ф. Возникновение Белоруссии: новая концепция. Мінск,1991. – 143 с.
2. Сувалаў, А. М. Месца тэорыі «балцкага субстрату» В. В. Сядова ў гістарыяграфіі праблемы этнагенезу беларусаў 60-х – першай паловы 80-х гг. XX ст. / А. М. Сувалаў // Вестник Академии МВД Республики Беларусь. - 2017. - № 2. - С. 192 - 195.
3. Кабашнікаў, К. П. Беларускі фальклор у параўнальным асвятленні: гіст. нарыс / К. П. Кабашнікаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – С. 47–55.
4. Прырода ў фарміраванні беларускага этнасу / Алена Хмелянок // Аўтэнтычныфальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : зборнік навуковых прац удзельнікаў VI Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 27—29 красавіка 2012 г.) / [рэдкалегія: М. А. Мажэйка (старшыня) і інш.]. – Мінск, 2012. – С. 76–77.
5. Ліцвінка В. Святы і абрады беларусаў. – Мінск, 1997. – 200 с.


## Тэма 2. Характэрныя асаблівасці матэрыяльнай культуры беларусаў

***Пытанні***

1. Кулінарныя традыцыі беларусаў. Класіфікацыя страў. Сімволіка-абрадавае значэнне.
2. Хлеб і мучныя стравы. Іх роля ў беларускай кухні.
3. Малако і малочныя прадукты ў традыцыйным харчаванні.
4. Мясныя і рыбныя стравы.

***Спіс рэкамендаванай літаратуры***


1. Цітоў В.С. Народная спадчына: Матэрыяльная культура ў лакальна-тыпалагічнай разнастайнасці / В.С. Цітоў.- Мінск: Навука і тэхніка, 1994. — 300с.
2. «Штоб вышай... угору...»: канцэпцыя падводу ў фальклорнай традыцыі / ГенадзьЛапацін // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання:зборнік навуковых прац удзельнікаў VI


РЭПАЗІТОРЫЙ.БГУКИ

Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 27—29 красавіка 2012 г.) / [рэдкалегія: М. А. Мажэйка (старшыня) і інш.]. – Мінск, 2012. – С. 179–182.

3. Васілевіч У. Дай божазнаць, з кім век векаваць. – Мінск, 1993. – 54 с.

**Тэма 3. Сямейна-радавыя, рытуальна-абрадавыя комплексы**

***Пытанні***

1. Сям'я, сямейныя адносіны і абрады ў розных народаў (параўнальны аспект).
2. Гісторыя беларускай сям'і: тыпы і структура, традыцыі і сучаснасць.
3. Сямейныя традыцыі і народная педагогіка, радавод і сістэма сваяцтва.
4. Сацыяльныя і рэгіянальныя асаблівасці сям'і, сямейных звычаяў і абрадаў.

***Спіс рэкамендаванай літаратуры***

1. Кантэкстуальныя асновывы вучэння традыцыйнай славянскай абраднасці / Цітавец А. В. // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : [зборнікартыкулаў] / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытутмастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклоруімя К. Крапівы». – Мінск, 2008. – Вып. 4. – С. 441–447.
2. Народныя гульні як сродак выхавання ў моладзі маральных якасцей / Тамара Савельева // Традыцыйная культура і дзеці: праблемы этнавыхавання / Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, УА «Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры». – Мінск, 2008. – Вып. 3. – С. 222–227.
3. Спецыфіка стылізацыі абраду / А. М. Аляхновіч // Навуковы пошук у сферы культуры і мастацтва: традыцыі і сучаснасць :матэрыялы навуковай канферэнцыі (Мінск, 28 лістапада 2014 г.) / [рэдкалегія: Ю. П. Бондар (старшыня) і інш.]. – Мінск, 2016. – С. 16–21.
4. Традыцыі вясельнай абраднасці Гомельскага Палесся (на матэрыяле фальклору Жыткавіцкага раёна) / В. С. Новак // Святло скарынавых ідэй : да 90-годдзя з дня нараджэння У. В. Анічэнкі : зборнік навуковых артыкулаў / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Установаадукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Францыска Скарыны», Навукова-даследчы інстытут гісторыі і культуры ўсходнеславянскіх народаў пры ГДУ ім. Францыска Скарыны. – Гомель, 2014. – С. 18–23.

**Тэма 4. Традыцыйны беларускі каляндар. Каляндарна-абрадавая паэзія**

***Пытанні***

1. Традыцыйны беларускі каляндар: гісторыя фарміравання, дыялог культур, сістэма сацыякультурных каштоўнасцей.
2. Міфапаэтычная мадэль свету беларусаў.
3. Падзел на чатыры каляндарныя цыклы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Жанравыя песенныя формы (заклінальныя, рытуальныя, велічальныя, дакаральныя (жартоўныя) і абрадавыя лірычныя песні).

***Спіс рэкамендаванай літаратуры***


1. Гурский, А.И. Зимняя поэзия белорусов: по записям XIX–XXвв. / А. И. Гурский. – Минск: Наука  техника, 1980. – С. 57–65.
2. Лозка, А.Ю. Беларускі народны каляндар /А.Ю.Лозка. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск: Полымя, 2002. – С. 38–40, 187–190.
3. Купальскія і пятроўскіяпесні. – Мінск, 1985. – 254 с.


## Тэма 5. Тэорыя фальклору. Гісторыя беларускай фалькларыстыкі

***Пытанні***

1. Тыпы фальклорных традыцый («архаіка», «класіка», «постфальклор»), культурна-гістарычныя і сацыяльныя крытэрыі іх вызначэння.
2. Фальклор як папярэднік розных мастацтваў (музычны, драматычны, харэаграфічны фальклор).
3. Фальклор як сінтэтычны від мастацтва.
4. Адметныя рысы фальклору: а) калектыўнасць; б) традыцыйнасць; в) варыятыўнасць; г) вуснасць; д) сінкрэтызм.

***Спіс рэкамендаванай літаратуры***


1. Беларускі фальклор : хрэстаматыя / склад. К. П. Кабашнікаў, А. С. Ліс, А. С. Фядосік, І. К. Цішчанка. – Мінск, 1996. – С. 56–59.
2. Беларускія народныя абрады / склад., навук. рэд. і прадм. Л. П. Касцюкавец. – Мінск : Беларусь, 1994. – С. 67–69.
3. Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : (памяці антраполага Зінаіды Мажэйкі) : зборнік навуковых прац удзельнікаў IX Міжнароднай навуковай канферэнцыі (Мінск, 24―26 красавіка 2015) / [рэдкалегія: В. Р. Языковіч (адказнырэдактар) і інш.]. – Мінск, 2015. – С. 149–150.
4. Ковалёва, Р. М.  Интегративная фольклористика : учеб.-метод. пособие / Р. М.Ковалёва, О. В.Приемко.– Минск: БГУ, 2017. – 239 с.


## Тэма 6. Сямейна-абрадавая паэзія: слова, дзеянне, ат рыбут. Пазаабрадавая паэзія

***Пытанні***

1. *Радзінная паэзія.* Радзінна-хрэсьбінная тэма ў прыказках і прымаўках.
2. *Вясельная паэзія.* Асаблівасці мастацкіх вобразаў і паэтычнай мовы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вясельнай паэзіі.
3. *Хаўтурныя галашэнні.* Дзяды.
4. *Пазаабрадавыя лірычныя песні*: пачуцці і перажыванні як іх паэтычная рэальнасць.

***Спіс рэкамендаванай літаратуры***


1. Аб праблемах пераймання спеўных традыцый / ІрынаМазюк // Традыцыйная культура і дзеці: праблемы этнавыхавання / Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, УА «Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры». – Мінск. – 2008. – Вып. 3. – С. 100–103.
2. У пошуках фальклорных песенных традыцый Гомельшчыны / Кацярына Магонава // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : (памяці антраполага ЗінаідыМажэйкі) : зборнік навуковых прац [удзельнікаў X Міжнароднай навуковай канферэнцыі, 29 красавіка – 1 мая 2016 г., г. Мінск / рэдкалегія: В. Р. Языковіч (старшыня) і інш.]. – Мінск, 2016. – С. 262 –263.
3. Козенка, М.А. Традыцыйнае вяселле Мядоцкага краю/ М. А. Козенка, А. А. Абрамовіч; навук. рэд. Т.Б. Варфаламеева. – Мінск: Чатыры чвэрці, 2005. – С. 54–60.
4. Кухаронак Т. І. Радзінныя звычаіі абрады беларусаў / Т. І.Кухаронак. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993.–126 с.


## Тэма 7. Народная проза беларусаў. Народны тэатр

***Пытанні***

1. Народная проза.
2. Дыскурсіўная і наратыўная проза.
3. Казкавая проза беларусаў.
4. Жанры няказкавай прозы.
5. Жанравызначальныя прыкметы паданняў, легенд, прымхліц, бываліц, апавяданняў-успамінаў, анекдотаў.
6. Рэалістычныя аповеды: бываліцы (рус. «сказы»), апавяданні-ўспаміны (мемуары).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Спіс рэкамендаванай літаратуры*


1. Байбурин А.К. Ритуал в традиционной культуре. – СПб: Наука, 1993. – 204 с.
2. Народны тэатр. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 512 с.
3. Традыцыйны фальклор Магілёўскага Падняпроўя. – Мінск : 1996. – 126 с.
4. Лозка, А.Ю. Тэатралізаваныя школьныя святы / аўт.-склад. А. Ю. Лозка, І.І. Кірчук. – Мінск : БелЭн, 2004. – С. 33–40.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Форма бягучай атэстацыі – залік.**

## МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ БЯГУЧАЙ АТЭСТАЦЫІ СЛУХАЧОЎ

### Пытанні да заліку

1. Этнагенез беларусаў, канцэпцыі паходжання.
2. Беларусь на гістарычных картах, этнічная тэрыторыя.
3. Рэгіянальны падзел этнічнай тэрыторыі. Геаграфічнае размяшчэнне рэгіёнаў.
4. Асаблівасці традыцыйна-бытавой культуры ў розных рэгіёнах Беларусі.
5. Этнічны склад і этнапалітычная сітуацыя ў краіне.
6. Геаграфія рассялення і гістарычныя тыпы паселішчаў.
7. Арганізацыя жылога асяродка, асноўныя функцыянальныя і архітэктурна-будаўнічыя адметнасці.
8. Народная гаспадарка і традыцыі земляробства беларусаў.
9. Промыслы і рамёствы як адлюстраванне народнага побыту, працоўных традыцый, навыкаў, уменняў, самабытнага таленту і мастацкага густу народа.
10. Нацыянальны характар ежы, яго абумоўленасць мясцовай экалогіяй, схільнасцю народа да тых ці іншых прадуктаў і страў, кулінарнымі традыцыямі, духоўна-рэлігійнымі уяўленнямі.
11. Адзенне – этнічны і сацыяльны паказчык.
12. Сям'я і сямейныя традыцыі.
13. Паняцце «фальклор» і яго разнавіднасці.
14. Гісторыя беларускай фалькларыстыкі, сувязь з іншымі навукамі.
15. Вусны народна-паэтычны каляндар беларусаў. Новы год у календары.
16. Зімовыя абрады і песні.
17. Святы і каляндарна-абрадавая паэзія веснавога перыяду.
18. Паэзія і абраднасць лета.
19. Восеньскія песні і абраднасць.
20. Радзінная і хрэсьбінная абраднасць і паэзія.
21. Вяселле: абраднасць і песні.
22. Пахавальныя і памінальныя абрады. Галашэнні.
23. Пазаабрадавая паэзія: песні пра каханне, сямейна-бытавыя песні, балады і жорсткія рамансы.
24. Пазаабрадавая паэзія:жартоўныя песні, прыпеўкі, карагодныя, танцавальныя і гульнёвыя песні.
25. Казкавая проза.
26. Легенды, паданні, вусныя апавяданні, прымхліцы.
27. Парэміялагічныя жанры: выслоўі, загадкі, прыказкі і прымаўкі, прыкметы і павер'і.
28. Рэалістычныя аповеды: бываліцы, апавяданні-ўспаміны (мемуары).
29. Народны тэатр. Батлейка.
30. Дзіцячы фальклор.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

# СПІС РЭКАМЕНДАВАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

## *Асноўная*


1. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры [Электронны рэсурс] : 20ліп. 2016 г., № 413-3 : прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрв. 2016 г. : адобр. Саветам Рэсп. 30 чэрв. 2016 г. //ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. - Мінск, 2017.
2. Беларуская вуснапаэтычная творчасць: падруч. для студэнтаў філал. спец. ВНУ / К.П. Кабашнікаў[і інш.]. – 2-е выд., перапрац. – Мінск: Лексіс, 2000. – 512 с.
3. Беларускі фальклор : хрэстаматыя / склад. К. П. Кабашнікаў, А. С. Ліс, А. С. Фядосік, І. К. Цішчанка. –4-е выд., перапрац. – Мн.: «Вышэйшая школа», 1996. – 856с.
4. Беларускія народныя абрады / склад., навук. рэд. і прадм. Л. П. Касцюкавец. – Мінск : Беларусь, 1994. – 128 с.
5. Гурский, А. И. Зимняя поэзия белорусов: по записям XIX–XXвв. / А. И. Гурский. – Минск : Наука техника, 1980. – С. 57–65.
6. Земляробчы каляндар: Абрады, звычаі / Рэдкал.: А.С.Фядосік і інш. – Мінск : Навука і тэхніка, 2003. – 405 с.
7. Кабашнікаў, К. П. Беларускі фальклор у параўнальным асвятленні: гіст. нарыс / К. П.Кабашнікаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – С. 47–55.
8. Казакова, І.В. Беларускі фальклор: вучэб. дапам. / І.В. Казакова. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2007. – 309 с.
9. Ковалёва, Р. М. Интегративная фольклористика : учеб.-метод. пособие / Р. М.Ковалёва, О. В.Приемко. – Минск: БГУ, 2017. – 239 с.
10. Лобач, У.А. Этнаграфія Беларусі: Вучэбна-метадычны комплекс / У.А. Лобач. – Наваполацк: ПДУ, 2006. – 328 с.
11. Міфалогія беларусаў: энцыкл. слоўн. / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. Мінск: Беларусь, 2011. – 607 с. Народная культура Беларусі: энцыкл. даведнік / рэд. В.С. Цітоў. – Мінск : БелЭН, 2002. – 431 с.
12. Лозка, А. Ю. Беларускі народны каляндар /А. Ю. Лозка. – 2-е выд., перепрац. і дап. – Мінск : Полымя, 2002. – 240 с.
13. Лозка, А. Ю. Тэатралізаваныя школьныя святы / аўт.-склад. А. Ю. Лозка, І. І. Кірчук. – Мінск : БелЭн, 2004. – 176 с.
14. Седов В .В . Славяне Верхнего Поднепровья и Подвинья / В .В . Седов.- М.: Наука, 1970. — 200 с.
15. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т., 10 кн. / Рэдкал.: Т.Б. Варфаламеева [гал рэд.]і інш.– Мінск : Вышэйшая школа. – 2008– 2013.
16. Швед, І.А. Уводзіны ў фальклярыстыку: вучэб.-метад. дапаможнік. У 2 ч. / І.А. Швед. – Брэст: БрДУ. –2009–2010.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

17. Цітоў В.С. Народная спадчына: Матэрыяльная культура ў лакальна-тыпалагічнай разнастайнасці / В.С. Цітоў.- Мінск: Навука і тэхніка, 1994. — 300с.
18. Цітоў, В. С. Этнаграфічная спадчына. Беларусь. Традыцыйна-бытавая культура. – Мінск: Беларусь, 2001. – 207 с.
19. Этнаграфія Беларусі : энцыклапедыя / Беларус. сав. энцыкл. ; рэдкал.: І. П. Шамякін (гал.рэд.) і інш. – Мінск : БелСЭ, 1989. – С. 225–300.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Дадатковая*

1. Балады: у 2 кн. / уклад., сістэм., уступ. арт. і камент.Л.М.Салавей. – Мінск: Навука і тэхніка, 1977–1978. – 180 с.
2. Барташэвіч, Г.А. Магічнае слова: вопыт даследавання светапогляднай і мастацкай асновы замоў / Г.А.Барташэвіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 127 с.
3. Беларускія народныя прыкметы і павер'і / уклад. У. Васілевіч. – Мінск, 1996–1999. – 160 с.
4. Беларусы: у 8 т. – Мінск, 1995–1999. – Т. 1–3.
5. Валачобныя песні / склад.: Г.А.Барташэвіч, Л.М.Салавей; склад. музыч.часткі і аўт.уступ.артыкула В.І.Ялатаў; рэдкал.:В.К.Бандарчык і інш.;рэд.тома К.П.Кабашнікаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1980. – 560 с.
6. Валодзіна, Т.В. Малыя жанры. Дзіцячы фальклор / Валодзіна Т. В., Гурскі А.І., Барташэвіч Г.А., Кабашнікаў К.П ; навук. рэд. Фядосік А.С. – Мінск: Беларуская навука, 2004. – 438 с.
7. Веснавыя песні / склад.: Г.А.Барташэвіч, Л.М.Салавей; склад. муз. часткі В.І.Ялатаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1979. – 608 с.
8. Восеньскія і талочныя песні / склад. А.С.Ліс; уклад. і камент. талоч. песень С.І.Асташэвіч; муз. частка В.І.Ялатава. –Мінск: Навука і тэхніка, 1981. – 678 с.
9. Выслоўі / склад.,сістэмат. тэкстаў,уступ.артыкул. і камент. М. Я. Грынблата; рэдкал.:В.К.Бандарчык і інш.; рэд.тома А.С.Фядосік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1979. – 519 с.
10. Вяселле: Абрад/ уклад.,уступ.артыкул і камент.К.Цвірка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1978. – 636 с.
11. Вяселле: мелодыі / склад. З.Я.Мажэйка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 628 с.
12. Вяселле:песні: у 6 кн. / склад. Л.А.Малаш; муз. дадатакЗ. Я. Мажэйкі. –Мінск, 1978–1988.
13. Грынблат, М.Я. Легенды і паданні / склад. : М.Я.Грынблат, А. І. Гурскі. – 2-е выд., дап. і дапрац.– Мінск: Беларуская навука, 2005. – 550 с.
14. Гурскі, А.І. Загадка ў славянскім фальклоры / А.І. Гурскі. – Мінск: Беларуская навука, 2009. – 83 с.
15. Гурскі, А.І. Мудрасць жыцця: прыказкі, прымаўкі / А.І. Гурскі. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2007. – 93 с.
16. Гурскі, А.І. Пазаабрадавая паэзія / Гурскі А.І.,Пятроўская Г.А., Салавей Л.М. ; навук.рэд. А.С.Фядосік. – Мінск: Беларуская навука, 2002. – 563 с.
17. Гурскі, А.І. Святкаванне каляд на Беларусі / А.І.Гурскі. – Мінск: Універсітэцкае, 1998. – 94 с.
18. Дзіцячы фальклор / склад. Г.А.Барташэвіч; склад. муз.часткі В. І. Ялатаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1972. – 734 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

19. Жаніцьба Цярэшкі / уклад. тэкстаў, уступ. арт. і камент. Л. М. Салавей ; склад. муз. часткіІ.Д.Назіна. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 519 с.
20. Жартоўныя песні / склад., сістэм. тэкстаў, уступ. арт. і камент. І. К. Цішчанкі; муз. частка С. Г.Нісневіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1974. – 728 с.
21. Жарты, анекдоты, гумарэскі / склад. А. С.Фядосік; уступ.арт. А. С. Фядосіка; камент. Л. Р.Барага і А. С.Фядосіка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 438 с.
22. Жніўныя песні / уступ. арт., уклад., сістэм. тэкстаўі камент. А. С. Ліса ; муз. частка В. І.Ялатава. – Мінск: Навука і тэхніка, 1974. – 815 с.
23. Зімовыя песні: калядкіі шчадроўкі / уклад., сістэм. тэкстаў, уступ. арт. І камент. А. І.Гурскага; муз. частка3. Я.Мажэйкі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 735 с.
24. Загадкі / склад. М.Я.Грынблат, А. І.Гурскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1972. – 448 с.
25. Замовы /уклад., сістэм. тэкстаў, уступ. арт., камент.Г. А. Барташэвіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 595 с.
26. Земляробчы каляндар: абрады і звычаі / уклад., класіф.,сістэм. матэрыялаўі камент. А. І.Гурскага;уступ. арт. А. І.Гурскага, А. С.Ліса. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – С. 111–115, 234–239.
27. Козенка, М.А. Традыцыйнае вяселле Мядоцкага краю/ М. А. Козенка, А. А. Абрамовіч; навук. рэд. Т.Б. Варфаламеева. – Мінск: Чатыры чвэрці, 2005. – С. 54–60.
28. Купальскія і пятроўскія песні / уклад. тэкстаў А.С.Ліс і С. Т. Асташэвіч; уступ. арт. А.С.Ліса; камент. С.Т.Асташэвіч. –Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – С. 45–53.
29. Навагродскі, Т.А. Традыцыі народнага харчавання беларусаў / Т.А. Навагродскі. – Мінск : НІА, 2000. – 112с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ